# Журналістыка

В. П. ВАРАБ'ЁЎ

## ПАЛЕМІКА Ў СУЧАСНАЙ ГАЗЕТНАЙ ПРАКТЫЦЫ І НЕАБХОДНАСЦЬ ЯЕ НАВУКОВАГА АСЭНСАВАННЯ

Палеміка — адно з самых усюдыісных слоў у сённяшнім грамадскім лексіконе. Інакш і быць не можа: у моманты крутых пераломаў, калі кіпяць страсці, калі людзі ў пошуку, а адкрыццё новых шляхоў для грамадства ажыццяўляецца праз пошук і набыццё кожным уласнай жыццёвай мэты,— у такія моманты не застаецца месца самазаспакоенасці і дагматычнай самаўпэўненасці. Сітуацыя ў грамадскай свядомасці характарызуецца надзвычай шырокім дыяпазонам думак, разваг, ацэнак. І гэта натуральна, бо ў розных слаёў насельніцтва і сацыяльных груп, у кожнага канкрэтнага чалавека асабісты, адрозны ад іншых узровень ведаў, свой сацыяльны вопыт і светаадчуванне, свае запатрабаванні, інтарэсы, памкненні.

Менавіта таму, але і не толькі па гэтай прычыне, палемічнае слова і слова пра палеміку гучыць амаль штодзённа з газетных старонак. Па досыць прыблізных падліках «сямёрка» рэспубліканскіх газет («Народная газета», «Рэспубліка», «Советская Белоруссия», «Звязда», «Белорусская нива», «Чырвоная змена», «Знамя юности») за 1991 г. правяла на сваіх старонках амаль паўтары сотні дыскусій, большасць з якіх прысвечана набалелым праблемам эканомікі і палітыкі, навукі і культуры, экалогіі і вобразу жыцця. Гарачыя спрэчкі вядуцца па пытаннях гісторыі, нацыянальных адносін. Наогул газетным радком пераасэнсоўваецца мінулае, сённяшняе і будучае.

Дынаміка і маштаб палемікі ў друку характарызуюць яе як значную з'яву ў практыцы журналістыкі. І не толькі цяперашняй, але і заўтрашняй. Прагноз на перспектыву для газетных спрэчак вельмі спрыяльны: за цалкам адмаўлення і ганьбавання, якія зараз дамініруе, паўстае неабсяжная цаліна стваральных дыскусій па ўладкаванню нашага расхрыстанага жыцця.

На фоне гэтага працэсу занадта кантрасным выглядае навуковы бок праблемы. Нешматлікія працы па вывучэнню палемікі ў друку скіраваны, за рэдкім выключэннем, у далёкае мінулае [1]. Большасць распрацовак носіць значны адбітак умоў часу напісання, але можа служыць фактам гісторыі навукі. Па-за даследчым ужыткам застаюцца сучасныя тэматычныя плыні, грамадскія, палітычныя, змястоўныя аспекты, істотныя рысы, тыповыя здабыткі і страты палемічнага асэнсавання журналістыкай рэчаіснасці і пульсу грамадскай думкі. Ды і не толькі яны.

Таму і не парадаксальна: за шматлікімі газетнымі рубрыкамі «Дыялог», «Размова», «Спрэчка», «Дыспут», «Дэбаты», «Дыскусія», «Позірк», «Пункт гледжання», «На перакрыжаванні думак» і інш. не прасочваецца свядома дыферэнцыраваны выбар рэдакцый, што характарызуе не столькі тэрміналагічную блытаніну асобных журналістаў, колькі дыягназуе агульны павярхоўны погляд на мэты, сродкі і змест палемікі, яе прынцыпы і функцыі. Іншага падыходу цяжка і чакаць, бо да сённяшняга часу здараецца як прамое атаясамліванне крытычных і палемічных тэкстаў, так і катэгарычна дыяметральнае іх супрацьпастаўленне. Дыялектыка адносін факта і думкі замяняецца дагматычна-суб'ектыўным «больш крытычны — менш палемічны» і наадварот. Падобнаму алгарытму падпарадкоўваюцца

і памкненні ў тэорыі і практыцы паставіць знак роўнасці паміж палемікай вуснай і палемікай у друку. Нібыта не існуе розніцы паміж імпульсіўным ажыятажам і ўдумлівай разважлівасцю. Нават гэты пералік «белых плямаў» палемікі як з'явы журналісцкай творчасці і грамадскага жыцця сведчыць пра наспеласць іх распрацоўкі.

Феномен палемікі ў друку надзвычай шматгранны і вымагае адпаведных даследчых захадаў. Адным з іх, відаць, павінна быць абгрунтаванне прыроды, пошукавага патэнцыялу, грамадскага прызначэння і сацыяльнай ролі палемікі ў друку. Рашэнне гэтай задачы, бясспрэчна, спрыяла б не толькі абагульненню вопыту розных рэдакцый і асобных журналістаў з мэтай нарошчвання інтэлектуальнай скарбонкі, але і магло б прадухіліць назіраемае апошнім часам абясцэньванне газетных дыскусій, якім належыць і будучая камунікацыйная прастора.

Безумоўна павучальнымі і для грамадскасці, і для журналістаў сталі ў апошнія гады дыскусіі пра будучае беларускай мовы і Чарнобыльскую трагедыю беларускага народа. Напружаная палеміка, у якой удзельнічаў літаральна ўвесь друк рэспублікі, дапамагла Беларусі не столькі дакрычацца да свету пра Чарнобыльскі боль, як даведацца ўсю жорсткую праўду. Чытачоўская і журналісцкая рада шматлікіх «за» і «супраць» абгрунтавала такія выніковыя сцвярджэнні, якія адпавядаюць рэчаіснасці, высвятляюць ісціну.

Наўрад ці быў прыняты парламентам, а галоўнае — людзьмі Закон аб дзяржаўнасці беларускай мовы, калі б яму не папярэднічала шматгадовая палеміка (асабліва на старонках «ЛіМа», «Звязды») пра лёс душы народа. Менавіта дэталёвае абмеркаванне зрушыла з кропкі замярзання адносіны да мовы. У выніку была створана адносна спрыяльная атмасфера ў грамадскай думцы, якая садзейнічала ўзважанаму характару самога Закона і плённасці яго ажыццяўлення.

Гэтыя акцыі беларускай журналістыкі крышталізуюць пагляд на з'яву палемікі ў друку: а) як метад высвятлення ісціны, актывізацыі і фарміравання грамадскай думкі чытачоў; б) як прынцып выпрацоўкі найбольш рацыянальных, з грамадскага пункту гледжання, рашэнняў па надзённых пытаннях жыцця.

Разам з тым, відавочная дзейснасць адзначаных дыскусій акрэсліла шэраг праблем, якія патрабуюць асобнага дэталёвага аналізу. У першую чаргу гэта датычыцца ўплыву на выніковасць сацыяльна-псіхалагічных фактараў аўдыторыі і розных формаў увасаблення палемічных матэрыялаў на газетных старонках, лагічнага і эмацыянальнага ўзроўняў аргументацыі, абумоўленасці выкарыстання палемічных прыёмаў у кантэксце механізма спрэчкі розных відаў, стратэгічных і тактычных акалічнасцей самога працэсу абмеркавання і інш.

Звычайнае апытанне метадам інтэрв'ю сведчыць, што часам дыскусіі ўспрымаюцца журналісцкімі калектывамі як з'ява простая і зразумелая сама па сабе, цалкам універсальная і бяскрыўдная. Маўляў, газетная палеміка не вымагае вывучэння, усё будзённа як ньютонаўскі вердыкт «сіла ўздзеяння роўная сіле процідзеяння». Разважаючы так, палемісты рэдакцый пакідаюць па-за ўвагай некалькі акалічнасцей: па-першае, што прыведзеная формула не аксіёма, а закон, і закон фізікі; па-другое, што ён быў адкрыты шляхам навуковага асэнсавання (эмпірычныя факты — абагульненне — фармуляванне заканамернасці), паклаўшага пачатак свядомаму выкарыстанню яго ў складаных працэсах механікі. Відавочна, што старая хвароба некаторых журналістаў на ігнараванне тэарэтычных падмуркаў інфармацыйных з'яў і працэсаў дае новы рэцыдыў у адносінах дыскусійных тэкстаў.

Да таго ж, тыражы заклікаў да палемікі міжволі ствараюць у аўтараў і чытачоў ілюзію яе лёгкасці і неабавязковасці, непадуладнасці ні законам логікі і псіхалогіі чалавека, ні тэорыям аргументацыі і псіхалінгвістыкі, ні нормам этыкі і эстэтыкі, адказнасці за грамадскі рэзананс. Адсюль — высвятленне важнейшых сацыяльна-палітычных пытанняў тымі відамі, сродкамі і формамі палемікі, з дапамогай якіх высветліць нічога нельга, акрамя як засведчыць сваю адмоўную эмоцыю. Адсюль — абарона пазіцыі апантанай самаўпэўненасцю, а не сілай аргументаў. Адсюль — нават сур'ёзныя палемічныя тэксты афарбаваны агрэсіўнасцю. Адсюль — усялякія прыёмы ідуць у палемічны радок: прыдзірлівасць, падазронасць, падлоўліванне, падсмейванне і г. д.

У выніку спусташальна-разбураючыя і ганьбавальна-прыніжаючыя тэндэнцыі літаральна захліснулі плынь дыскусій, што не можа не адбівацца на светаадчуванні кожнага чалавека асобна і грамадства ў цэлым. І ўжо дыя-

гназуюцца некаторыя праявы агрэсіўнасці і прыгнечанасці, поўнай дэзарыентацыі і недаверу, выкліканыя не ў апошнюю чаргу і пралікамі палемічнай дзейнасці журналістаў. Гэтаму спрыяюць слабая распрацаванасць тэарэтычных асноў газетнай палемікі, нізкая эфектыўнасць нарматыўнай базы Закону аб друку, бедная культуралагічная і метадычная падрыхтаванасць журналісцкіх кадраў.

Такім чынам, вывучэнне палемікі ў друку мэтазгодна як у тэарэтычным аспекце, так і прагматычным плане. Прадмет навуковых асноў палемікі ў друку можна вызначыць як абагульненне яе тэорыі і практыкі журналістыкі і выпрацоўку (з улікам дасягненняў сумежных навук) абгрунтаваных метадычных правілаў і рэкамендацый, накіраваных на павышэнне ўзроўню і культуры палемічнага майстэрства.

[1] Гл.: Блажнов Е. А. От полемики к дискуссии // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 2. Журналистика. 1974. № 2; Прошунин Н. Ф. Что такое полемика? М., 1985; Федосеев П. Н., Попов С. Н. и др. Об искусстве полемики. М., 1982; Ученова В. В. «Сегодня» газетной полемики // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 2. Журналистика. 1966. № 1.

П. П. ТКАЧЕВА

## КАЛАМБУР И ГИПЕРБОЛА В СМЕХОВОМ МИРЕ А. Т. АВЕРЧЕНКО

Смех в рассказах и фельетонах А. Т. Аверченко неоднороден по характеру и направленности. Это не только добродушная улыбка, это и шутка, и острота, и различные виды иронии, организованные при помощи разнообразных изобразительных средств и стилистических фигур.

Оригинальные каламбуры А. Т. Аверченко использовал для создания особых оттенков смеха. Так, к октябристу Чикалкину (рассказ «Октябрист Чикалкин») пришел околоточный надзиратель и сообщил, что собрание избирателей, на котором он (Чикалкин) должен был выступать, «...не может быть разрешено.

— Почему? — спросил изумленный Чикалкин.

— Потому. Неразрешенные собрания воспрещаются!

— Так вы бы и разрешили.

Околоточный снисходительно усмехнулся:

— Как же это можно: разрешить неразрешенное собрание. Это противозаконно.

— Но ведь, если вы разрешите, оно уже перестанет быть неразрешенным,— сказал, подумавши немного, Чикалкин.

— Так-то оно так,— ответил околоточный, еще раз усмехнувшись бестолковости Чикалкина.— Да как же его разрешить, если оно пока что неразрешенное? Посудите сами»[1].

Как видим, вся эта часть рассказа (и смеховой тонус) держится на каламбуре. Октябрист Чикалкин просит «разрешить неразрешенное собрание» (тогда оно станет разрешенным), околоточный надзиратель не может понять: как это «разрешить неразрешенное собрание». Каждый по-своему прав. Октябрист Чикалкин прав потому, что неразрешенное собрание уже не будет таковым, если его разрешить, околоточный надзиратель — страж законности и порядка — считает, что нельзя разрешить, поскольку собрание не разрешено вышестоящими властями.

Столкновение: с одной стороны, непонимание (околоточный надзиратель), с другой — стремление добиться «разрешения неразрешенного собрания» — (октябрист Чикалкин) проясняет характеры действующих лиц: непоколебимый страж порядка — околоточный надзиратель,— для которого, кроме закона, ничего не существует, и октябрист Чикалкин, легковесный политический деятель, требующий нарушить закон.

Перед нами образец снисходительного смеха с элементами наивности, загадочности, хотя последнее организуется уже не каламбуром, а поведением Чикалкина и околоточного:

«— Хорошо,— сказал зловеще спокойным тоном Чикалкин.— Мы внесем об этом в думе запрос.

— Распишитесь, что приняли к сведению,— хладнокровно кивнул головой околоточный»[2].

«Сказал зловеще спокойным тоном Чикалкин» и «хладнокровно кивнул